

# Дзявятыя Танкаўскія чытанні

100 1914–2014

*Да 100-годдзя ўніверсітэта*

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

# ДЗЯВЯТЫЯ ТАНКАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

**(да 100-годдзя ўніверсітэта)**

***Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі***

**г. Мінск, 26 верасня 2014 г.**

Мінск 2014

УДК 82(476)
ББК 83 (4Беи)
Д431

Рэдкалегія:
доктар філалагічных навук, прафесар *В.Д. Старычонак* (адк. рэд.);
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *І.М. Гоўзіч*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Н.В. Заяц*

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук, прафесар *В.П. Русак*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *В.Ю. Шыманская*

**Дзявятыя** Танкаўскія чытанні (да 100-годдзя ўніверсітэта) : матэрыялы
Д431 Міжнар. навук. канф., г. Мінск, 26 верас. 2014 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал.: В.Д. Старычонак, І.М. Гоўзіч, Н.В. Заяц ; адк. рэд. В.Д. Старычонак. – Мінск : БДПУ, 2014. – 300 с.

ISBN 978-985-541-189-6.

У зборніку прадстаўлены матэрыялы даследаванняў навукоўцаў у галіне мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогіі і інш. Вылучаны новыя тыпы літаратурнай творчасці ў сучаснай культурнай прасторы. Абгрунтоўваецца значэнне творчасці Максіма Танка ў кантэксце сусветнай паэтычнай традыцыі.

Адрасуецца навуковым работнікам, выкладчыкам, аспірантам, студэнтам, у сферы навуковых інтарэсаў якіх знаходзіцца асэнсаванне мастацкага вопыту беларускага класіка ў літаратуразнаўчым, лінгвістычным і культуралагічным аспектах.

**УДК 82(476)**
**ББК 83 (4Беи)**

**ISBN 978-985-541-189-6**

© БДПУ, 2014

---

*Базар Н.М. (Мінск)*

## Вечныя хрысціянскія ісціны ў творчасці Віктара Вабішчэвіча

Напэўна, няма такога празаіка ці паэта, які б абмінуў у сваёй творчасці пытанні жыцця і смерці, такога, хто хаця б раз звяртаўся ў творах да вышэйшых сіл, да Бога. Гэтыя спрадвечныя тэмы кранаюць душу і Віктара Вабішчэвіча. Яго чарговы зборнік «ORBI» (у перакладзе з лацінскай мовы – «свету»), што выйшаў у 2012 годзе, прасякнуты гэтымі тэмамі. Нават для назвы раздзелаў аўтар выбраў радкі з маліт-

вы: Ora pro nobis (з лацінскага «Маліся за нас»), Dominus tecum (з лацінскага «Бог з Табою»), Vitae supellex (з лацінскага «Упрыгажэнне жыцця»). У цэнтры многіх твораў – жыццё чалавека, сваё жыццё.

«Жыццё ў мяне адно» – так называецца адзін з вершаў Віктара Вабішчэвіча. І, як кажа ў ім паэт, «Жыццё адно – і крыж. / Як з гэтым не згадзіцца?» [1, с. 70], падпарадкоўваючыся волі лёсу. Але тут жа дадае: «А лепей паглядзіш – / У ім так многа жыццяў» [1, с. 70], маючы на ўвазе лёсы не толькі блізкіх і дарагіх сэрцу людзей, а і ўсіх тых, з кім даводзіцца сустракацца на жыццёвых перакрыжаваннях. «Шмат жыццяў ёсць у нас – / Пражыць іх давядзецца» [1, с. 70], бо гэта і «шляхі сыноў», «і лёсы мілых сёстраў», «думкі маці», «бацькаў лёс», «жончыны трывогі», «ціхі плач бяроз», «адчай людзей», «усе перажыванні» [1, с. 70].

І, як відаць, жыцці, якія пражывае Віктар Вабішчэвіч, зусім не лёгкія, таму часта ў творах апошніх гадоў ён звяртаецца да Бога. Але з-за грахоў дарога да Творцы цяжкая. І менавіта з-за грахоў яна такая жаданая: «Я ішоў да муроў Ватыкана – / З небыцця і пустэчы глухой <…> / Я ішоў праз бясконцыя хмары <…> / Я баяўся, ішоў, хваляваўся / Прапаўзаў там, дзе нельга прайсці <…> / Я ляцеў праз цяністыя далі <…> / Я імкнуўся, ішоў апантана <…> / І прыйшоў да муроў Ватыкана – / Каб застацца душой там навек» [1, с. 5].

Чалавек створаны па падабенстве Божым. За ўсе свае грахі чалавек адкажа перад Богам, у тым ліку і за знішчэнне святынь: «Мінуў той час – мы выракліся злога <…> / І погляд зноў скіроўваем да Бога» [1, с. 6].

Існуючыя ў хрысціянстве сімвалы сустракаем у вершах Віктара Вабішчэвіча. Гэта вобраз Божай Маці – заступніцы ўсіх людзей, анёл-прадвеснік, свечкі, цудадзейная крыніца, святыя крыжы. У вершы «Паданні пра крыж» выкарыстоўваецца вобраз каменнага крыжа, што стаіць «ля ціхай рэчкі на пагорку» [1, с. 27] і на працягу стагоддзяў становіцца сведкам усяго таго, што адбываецца на зямлі. Час праходзіць, людзі пра многае забываюць, а крыж памятае ўсё: «І не відаць вякоў тых ценю, / А крыж – пазнака іх – маўчыць. / Разгадваць будзем да магілы / Сівой мінуўшчыны сляды» [1, с. 27]. Крыж у хрысціянстве – сімвал Божай сілы і надзейная зброя супраць злых духаў. Таму паэт нагадвае чытачу, што пра гэта нельга забываць: крыж, знак выратавання, любові і Божай сілы, уратуе, крыж дапаможа.

Ёсць яшчэ ўласны крыж у кожнага чалавека – тое, што наканавана ў жыцці. Віктар Вабішчэвіч упэўніваецца ў думцы, што, як бы ні хацелася чалавеку, але свой крыж кожны пранясе па жыцці сам. І ад таго, як чалавек будзе несці яго, залежыць, якое месца прыстанку знойдзе душа пасля смерці. Паэт у малітвах да Бога звяртаецца з просьбай быць яму (Богу) адданым дзіцём. Свой крыж бачыць у служэнні роднаму беларускаму слову: «Спыніцца сэрца. І стану я словам, / Песняй жывой ручая, / Гукам дзівоснае роднае мовы, / Спевам начным салаўя» [1, с. 99].

Створаная для людзей цудадзейная крыніца становіцца месцам масавага паломніцтва. Месцам, куды прыходзяць людзі са спадзяваннем на цуд Божы, на магчымасць выратавання душы і пазбаўленне яе ад пакут: «Там не толькі новых сіл прыток – / Там пачуеш звон нябеснае званіцы, / Веры нашай чыстай там выток» [1, с. 16].

Душы толькі тых людзей, што ў сэрцы берагуць Божую ласку, будуць жыць шчасліва. А душы тых, хто вырашыў жыць без Бога, спадзеючыся толькі на сябе, часта зневажаючы Творцу, так і не знойдуць прытулку ў Царстве Божым. Такія душы на рынку душ «Забіраў сабе за тры грошы Шатан» [1, с. 23]. Іх вечны прыпынак вызначаны – пекла. Паэт кажа, што пазбегнуць пекла душа чалавека можа толькі тады, калі чалавек пакаецца за ўсе свае грахі перад Богам, ачысціць душу ад бруду. Цяжка прызнаць свае грахі, але Бог дапаможа, толькі чалавек павінен зрабіць важны крок: «Каля касцёла ў задуменні / стаіць-хвалюецца юнак, / Ды пад гатычныя скляпенні / Зайсці не можа ён ніяк <…> / Юнак ніяк не знойдзе сілы / Пераступіць за той парог, / Дзе чалавек здабудзе крылы / І дзе яго пачуе Бог. / Ды прыйдзе час – час немінучы, – / Калі юнак увойдзе ў храм – / Пад спеў узнёслы, неўміручы / Свой паратунак знойдзе там» [1, с. 15].

Праз таінства хрышчэння душа атрымлівае магчымасць у канцы жыцця трапіць да Бога і бясконца жыць з Богам. У час таінства душы даецца анёл-ахоўнік – сведка і абаронца жыцця чалавека. Таму хрышчэнне – падзея асабліва ўрачыстая. Радасць, спакой агортваюць усіх удзельнікаў абрада. Самы чаканы момант тут – «Імгненне цуду нараджэння / Бяссмерця чыстае душы» [1, с. 13]. Душа атрымлівае бяссмерце і толькі ад чалавека залежыць, з кім душа застанецца пасля сканчэння зямнога быцця.

Вера дае магчымасць чалавеку жыць, тварыць, спасцігаць таямніцы сусвету. «На крылах веры ты адчыніш дзверы / У свет, што ёсць аснова ўсіх асноў» [1, с. 12]. Таму Віктар Вабішчэвіч праз сваю творчаць праводзіць думку, што чалавек без веры, без Бога – усё роўна як малое бездапаможнае дзіця. А веру патрэбна ў сабе расціць на працягу ўсяго жыцця.

Хрысціянскія матывы праведзены праз увесь зборнік «ORBI». Яго творы яшчэ раз нагадваюць чалавеку аб тым, што існуе жыццё бяссмертнай душы. Вось толькі тое, дзе і з кім яно будзе, залежыць ад самаго чалавека.

### *Літаратура*

1. Вабішчэвіч, В.В. ORBI / В.В. Вабішчэвіч. – Мінск: Канфіда, 2012. – 104 с.

# ЗМЕСТ

*Жук А.І.* Уступнае слова ... 3
*Абдулкарим Али Махди.* Вторичные артефактные номинации в арабском и русском языках ... 5
*Адамовіч Г.Я.* «Ёсць нешта таямнічае...»: Максім Танк і музы ... 9
*Базар Н.М.* Вечныя хрысціянскія ісціны ў творчасці Віктара Вабішчэвіча ... 13
*Борбат Т.І.* Мастацкая літаратура і гісторыя: спецыфіка выкарыстання міжпрадметных сувязяў (на прыкладзе вывучэння творчасці Максіма Танка і Аркадзя Куляшова) ... 16
*Вашчыліна В.І.* Вобраз дарогі ў метафарычным апавяданні-прытчы Янкі Сіпакова «Тыя, што ідуць» ... 20
*Ганчарова-Цынкевіч Т.У.* Роля лірычных адступленняў у паэме Максіма Танка «Нарач» ... 23
*Гарадніцкі Я.А.* Пазавербальныя формы мастацкага выражэння ў літаратуры ... 26
*Герасімёнак М.А., Заяц Н.В.* Гістарычная тэма ў творчасці Максіма Танка і Алеся Пісьмянкова ... 31
*Гоўзіч І.М.* «Паэтычны сад» Раісы Баравіковай ... 34
*Гранкина Е.В.* Специфика концепта «насилие» в рассказе Д.К. Оутс «Куда ты идешь, где ты была?» через призму феминистской критики ... 38
*Груцо А.П.* Назоўнік «буцян» і вытворныя ад яго ў гаворцы Дубровеншчыны ... 44
*Гурская Ю.А., Найба Д.В.* Асацыятыўнае поле імя-сімвала ... 46
*Дрозд Д.Я.* Беларускі вясельны абрад ініцыяцыі ... 49
*Дубянецкі Э.С.* Уплыў народнага мастацтва на творчасць Максіма Танка ... 52
*Едка Г.С., Лобань Н.П.* Жаргонная лексіка ў беларускім перыядычным друку ... 56
*Ермаковіч К.А.* Каштоўнасны свет лірычнага героя Максіма Танка ў творчасці ваеннага перыяду ... 60
*Есіс Я.В.* Стан падрыхтаванасці настаўніка да працы з электроннымі адукацыйнымі рэсурсамі на ўроках беларускай літаратуры ... 64
*Жардзецкая А.У.* «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...»: вобраз Бацькаўшчыны ў паэзіі Максіма Танка ... 68
*Жук В.І.* Лёс франтавіка Першай сусветнай вайны ў творчасці Максіма Гарэцкага ... 72
*Забродская В.С.* Топас Муз у эпіталамах другой паловы XVI – першай паловы XVII стагоддзя ... 76
*Зарэцкая Н.У.* Метафара як праява імпрэсіяністычнай манеры Леаніда Дранько-Майсюка ... 81
*Заяц Н.В.* Песенная лірыка Генадзя Бураўкіна ... 84
*Кажамякін Г.В.* Культурная спадчына Максіма Танка ў фондах бібліятэкі БДПУ ... 89
*Камлевич Г.А.* Знакомство иностранных студентов с жизнью и творчеством Максима Танка: из опыта работы ... 92
*Кіслушчанка Г.А.* Трансфармацыя фальклорных матываў у лірыцы Рыгора Барадуліна ... 96
*Кожемяченко Е.В.* Тема Родины в поэзии Максима Танка и Марины Цветаевой ... 99
*Козіч В.І.* Проза Максіма Танка: штрыхі да сацыяльнага партрэта Заходняй Беларусі ... 103
*Кудреватых И.П.* Художественный образ как эстетический структурный элемент стиля ... 107